ЗАЦВЯРДЖАЮ
Начальнік упраўлення культуры Гродзенскага аблвыканкама
А.В. Клімовіч
2023 г.

ІНСТРУКЦЫЯ аб парадку арганізацыі і правядзення рэгіянальнага фестывалю-кірмашу вырабаў рамеснікаў “Гродзенскія традыцыі да свята Вялікадня”

1. Дадзеная інструкцыя вызначае парадак арганізацыі і правядзення рэгіянальнага фестывалю-кірмашу вырабаў рамеснікаў “Гродзенскія традыцыі да свята Вялікадня” (далей – Фестываль-кірмаш).
2. Мэтамі і задачамі Фестывалю-кірмашу з’яўляюцца: захаванне і папулярызацыя рэгіянальных асаблівасцей традыцыйнай нематэрыяльнай культуры Гродзенскай вобласці; знаёмства жыхароў і гасцей Гродзеншчыны з мясцовымі традыцыямі святкавання Вялікадня; павышэнне турыстычнага патэнцыялу Гродзенскага рэгіёну; развіццё розных відаў дэкаратыўна-прыкладнога мастацтва і традыцыйных рамёстваў, творчасці народных майстроў і носьбітаў нематэрыяльнай культурнай спадчыны Гродзеншчыны; далучэнне да традыцыйнай культуры дзяцей і падлеткаў, а таксама ўсіх жадаючых праз навучанне і майстар-класы ад носьбітаў традыцыйнай культуры Гродзеншчыны.
3. Арганізатарамі Фестывалю-кірмашу з’яўляюцца: упраўленне культуры Гродзенскага аблвыканкама, ДУК “Гродзенскі абласны метадычны цэнтр народнай творчасці” (Дадатак 1).
4. У рамках Фестывалю-кірмашу праводзіцца абласная выстаўка-конкурс дэкаратыўна-прыкладнога мастацтва “Велікодны падарунак” (далей – выстаўка-конкурс) (Дадатак 2).
5. Для падвядзення вынікаў выстаўкі-конкурсу зацвярджаецца склад журы (Дадатак 3), якое прысуждае прызы і дыпломы.
6. У Фестывалі-кірмашы прымаюць удзел майстры народнай творчасці раённых Цэнтраў рамёстваў, аддзелаў (сектараў) рамёстваў і традыцыйнай культуры раённых цэнтраў культуры і народнай творчасці, рамеснікі, носьбіты элементаў нематэрыяльнай культурнай спадчыны Гродзеншчыны.
7. Праграма Фестывалю-кірмашу ўключае: урачыстае адкрыццё свята; фальклорна-абрадавая праграма “Знаёмства з рэгіянальнымі асаблівасцямі святкавання Вялікадня на Гродзеншчыне”; майстар-класы ад майстроў народнай творчасці, рамеснікаў і носьбітаў элементаў

нематэрыяльнай культурнай спадчыны; выстаўку-продаж вырабаў майстроў народнай творчасці аддзелаў (сектараў) рамёстваў і традыцыйнай культуры раённых цэнтраў культуры і народнай творчасці, раённых Цэнтраў рамёстваў; падвядзенне вынікаў абласной выстаўкі-конкурсу; узнагароджванне пераможцаў, урачыстае закрыццё свята.

8. Работы, прадстаўленыя на Фестываль-кірмаш, абавязкова павінны адпавядаць велікоднай тэматыцы, традыцыям пэўнага віду народнай культуры і мастацка-рамесніцкім тэхналогіям. Кожны раён на падворку прадастаўляе тэматычную фотазону.

9. Фестываль-кірмаш праводзіцца ў г.Гродна за тыдзень да святкавання каталіцкага (01.04.2023 г.) Вялікадня.

10. Па выніках Фестывалю-кірмашу аддзелы (сектары) рамёстваў і традыцыйнай культуры раённых цэнтраў культуры і народнай творчасці, раённыя Цэнтры рамёстваў атрымліваюць дыпломы за захаванне і папулярызацыю рэгіянальных асаблівасцей традыцыйнай нематэрыяльнай культуры і яе носьбітаў, за якасную падрыхтоўку выстаўкі вырабаў рамеснікаў “Гродзенскія традыцыі да свята Вялікадня”.

11. Заяўкі для ўдзелу ў Фестывалі-кірмашы (Дадатак 4) дасылаюцца на электронны адрас ДУК “Гродзенскі абласны метадычны цэнтр народнай творчасці” (info@gromc.by) з адзнакай “Вялікдзень” да 20 сакавіка 2023 г. (тэлефоны для даведак: +375(152)687934, 623792, 623784).

12. Фінансаванне Фестывалю-кірмашу ажыццяўляецца за кошт сродкаў абласнога бюджэту, прадугледжаных у каштарысе ДУК “Гродзенскі абласны метадычны цэнтр народнай творчасці” на цэнтралізаваныя мерапрыемствы.

13. За кошт бюджэтных сродкаў фінансуецца: аплата майстрам за правядзенне майстар-класаў, паслугі па музычным афармленні і гукаўзмацненні, паслугі па прадастаўленні алюмініевай канструкцыі для задніка сцэны, арэнда падстрэшка, выраб дыпломаў, набыццё прызоў.

14. Для фінансавання Фестывалю-кірмашу могуць быць выкарыстаны іншыя крыніцы, не забароненыя заканадаўствам Рэспублікі Беларусь.

15. Аргкамітэт пакідае за сабой права ўносіць змены ў дадзеную Інструкцыю аб парадку арганізацыі і правядзення, а таксама перанос даты правядзення Фестывалю (у іншыя тэрміны).

Дадатак 1
да інструкцыі аб парадку арганізацыі і правядзення рэгіянальнага фестывалю-кірмашу вырабаў рамеснікаў “Гродзенскія традыцыі да свята Вялікадня”

СКЛАД АРГКАМІТЭТА
рэгіянальнага фестывалю-кірмашу вырабаў рамеснікаў
“Гродзенскія традыцыі да свята Вялікадня”

| | | |
|---|---|---|
| Клімовіч А.В. | – | начальніка ўпраўлення культуры Гродзенскага аблвыканкама, старшыня аргкамітэта; |
| Жук-Куніцкая І.Ю. | – | галоўны спецыяліст упраўлення культуры Гродзенскага аблвыканкама, сустаршыня аргкамітэта; |
| Хільмончык К.В. | – | дырэктар ДУК “Гродзенскі абласны метадычны цэнтр народнай творчасці”, намеснік старшыні аргкамітэта; |
| Барысевіч Я.А. | – | загадчык аддзела традыцыйнай мастацкай культуры ДУК “Гродзенскі абласны метадычны цэнтр народнай творчасці”; |
| Рамановіч Н.І. | – | намеснік дырэктара ДУК “Гродзенскі абласны метадычны цэнтр народнай творчасці”; |
| Пятрук А.П. | – | вядучы метадыст ДУК “Гродзенскі абласны метадычны цэнтр народнай творчасці” |

Дадатак 2
да іінструкцыі аб парадку арганізацыі і правядзення рэгіянальнага фестывалю-кірмашу вырабаў рамеснікаў “Гродзенскія традыцыі да свята Вялікадня”

# Умовы правядзення
# абласной выстаўкі-конкурсу дэкаратыўна-прыкладнога мастацтва “Велікодны падарунак” у рамках рэгіянальнага фестывалю-кірмашу вырабаў рамеснікаў “Гродзенскія традыцыі да свята Вялікадня”

## 1. Агульнае палажэнне

1.1. Дадзеная Інструкцыя вызначае парадак арганізацыі і правядзення абласной выстаўкі-конкурсу дэкаратыўна-прыкладнога мастацтва “Велікодны падарунак” у рамках рэгіянальнага фестывалю-кірмашу вырабаў рамеснікаў “Гродзенскія традыцыі да свята Вялікадня” (далей – Выстаўка-конкурс).

1.2. Выстаўка-конкурс праводзіцца з 14 сакавіка па 17 красавіка 2023 года ў выставачнай зале ДУК “Гродзенскі абласны метадычны цэнтр народнай творчасці”.

1.3. У Выстаўцы-конкурсе прымаюць удзел майстры народнай творчасці раённых Цэнтраў рамёстваў, аддзелаў (сектараў) рамёстваў і традыцыйнай культуры раённых цэнтраў культуры і народнай творчасці, рамеснікі, таленавітыя майстры, носьбіты элементаў нематэрыяльнай культурнай спадчыны Гродзеншчыны.

## 2. Мэты і задачы

2.1. Мэтамі і задачамі Выстаўкі-конкурсу з’яўляюцца: адраджэнне, захаванне і папулярызацыя розных відаў дэкаратыўна-прыкладнога мастацтва і традыцыйных рамёстваў, а таксама творчасці народных майстроў і носьбітаў нематэрыяльнай культурнай спадчыны Гродзеншчыны; далучэнне шырокай грамадскасціда асаблівасцей традыцыйнай культуры рэгёнаў лепшымі творамі дэкаратыўна-прыкладнога мастацтва; павышэнне ўзроўню майстэрства канкурсантаў.

## 3. Умовы правядзення

3.1. Выстаўка-конкурс праводзіцца па наступных намінацыях:

- “лепшая калекцыя традыцыйных велікодных яек”;
- “лепшая калекцыя сучасных велікодных яек”;
- “лепшая калекцыя традыцыйных велікодных вербаў” (кожны ўдзельнік прадстаўляе не менш за 5 вырабаў);

- “лепшая калекцыя сучасных велікодных вербаў” (кожны ўдзельнік прадстаўляе не менш за 5 вырабаў);

- “лепшае дэкаратыўнае пано, прысвечанае велікоднай тэматыцы”;

- “лепшая калекцыя велікодных паштовак” (кожны ўдзельнік прадстаўляе не менш за 5 вырабаў);

- “лепшая выставачная кампазіцыя на велікодную тэматыку” (ацэньваецца тэматычная цэласнасць велікоднай экспазіцыі раёна).

3.2. Конкурсныя работы, прадстаўленыя на Выстаўку-конкурс, павінны быць выкананы акуратна, у адпаведнасці з кампазіцыйнымі асаблівасцямі, адпавядаць велікоднай тэматыцы згодна з мастацка-рамесніцкімі тэхналогіямі, мець яркае і выразнае раскрыццё вобразаў. Магчыма эксперыментаванне з матэрыяламі.

3.3. Конкурсныя работы якія былі прадстаўлены ў выстаўках-конкурсах мінулых гадоў, не прымаюцца.

3.4. Прадстаўленыя на Выстаўку-конкурс работы неабходна суправаджаць тлумачальнай запіскай з указаннем назвы работы, прозвішча, імя, імя па бацьку аўтара, матэрыялу і тэхнікі выканання работы, поўнай назвы ўстановы, якую прадстаўляе канкурсант (-ы).

3.5. Для ўдзелу ў Выстаўцы-конкурсе да 28 лютага 2023 года накіроўваюцца заяўкі на электронны адрас ДУК “Гродзенскі абласны метадычны цэнтр народнай творчасці”: (info@gromc.by). Конкурсныя работы неабходна даставіць да 8 сакавіка 2023 года па адрасе: г. Гродна, вул. Савецкая, 8, ДУК “Гродзенскі АМЦНТ”. Даведкі па тэл.: 8 (0152) 68 79 34, 62 37 92, 62 37 84.

3.6. Камандзіровачныя і транспартныя выдаткі па дастаўцы выставачных работ за кошт накіроўваючай арганізацыі.

## 4. Падвядзенне вынікаў

4.1. Падвядзенне вынікаў і ўзнагароджванне пераможцаў Выстаўкі-конкурсу адбудзецца 1 красавіка 2023 года ў г. Гродна падчас правядзення рэгіянальнага фестывалю-кірмашу вырабаў рамеснікаў “Гродзенскія традыцыі да свята Вялікадня”.

4.2. Вынікі Выстаўкі-конкурсу журы падводзіць асобна па кожнай намінацыі. Пераможцы Выстаўкі-конкурсу ўзнагароджваюцца дыпломамі лаўрэата (I, II, III ступені) і прызамі.

4.3. Журы мае права прысудзіць у адной намінацыі некалькі дыпломаў лаўрэата II, III ступені з адпаведнымі прызамі ў межах агульнага прызавога фонду альбо не прысвойваць месцы, ці аб’ядноўваць намінацыі.

## 5. Фінансаванне

5.1. Фінансаванне Выстаўкі-конкурсу ажыццяўляецца за кошт сродкаў абласнога бюджэту, прадугледжаных у каштарысе ДУК

“Гродзенскі абласны метадычны цэнтр народнай творчасці” на цэнтралізаваныя мерапрыемствы.

5.2. За кошт бюджэтных сродкаў фінансуецца набыццё прызоў і дыпломаў.

5.3. Для фінансавання Выстаўкі-конкурсу могуць быць выкарыстаны іншыя крыніцы, не забароненыя заканадаўствам Рэспублікі Беларусь.

## 6. Форма заяўкі

### ЗАЯЎКА

на ўдзел у абласной выстаўцы-конкурсе дэкаратыўна-прыкладнога мастацтва “Велікодны падарунак”

1. Прозвішча, імя, імя па бацьку________________________________

________________________________________________________

2. Дата нараджэння______________________________________

3. Пашпартныя дадзеныя (серыя, нумар, калі і кім выдадзены)_______

________________________________________________________

4. Месца пражывання, кантактны тэлефон______________________

________________________________________________________

________________________________________________________

5. База дзейнасці (установа культуры, навучальная ўстанова, іншае)

________________________________________________________

________________________________________________________

6. Работы, прадстаўленыя на выстаўку-конкурс:

| № п/п | Намінацыя | Назва работы | Тэхніка выканання |
|---|---|---|---|
| 1. | | | |

***Заўвага:****да заяўкі дадаецца фота работ.*

Кіраўнік установы ____________________

*(подпіс, ініцыялы)*

Дадатак 3
да інструкцыі аб парадку арганізацыі і правядзення рэгіянальнага фестывалю-кірмашу вырабаў рамеснікаў "Гродзенскія традыцыі да свята Вялікадня"

СКЛАД ЖУРЫ
абласной выстаўкі-конкурсу дэкаратыўна-прыкладнога мастацтва "Велікодны падарунак"

| | | |
|---|---|---|
| Клімовіч А.В. | – | начальніка ўпраўлення культуры Гродзенскага аблвыканкама, *старшыня журы;* |
| Чушынская С.У. | – | загадчык аддзела народнай творчасці УК "Гродзенскі дзяржаўны гісторыка-археалагічны музей", *сустаршыня журы;* |
| Рамановіч Н.І. | – | намеснік дырэктар ДУК "Гродзенскі абласны метадычны цэнтр народнай творчасці", *намеснік старшыні журы;* |
| Аўчыннікаў А.Ф. | – | народны майстар Рэспублікі Беларусь, мастак; |
| Барысевіч Я.А. | – | загадчык аддзела традыцыйнай мастацкай культуры ДУК "Гродзенскі абласны метадычны цэнтр народнай творчасці"; |
| Гарчычка І.Ю. | – | вядучы метадыст ДУК "Гродзенскі абласны метадычны цэнтр народнай творчасці"; |
| Жук-Куніцкая І.Ю. | – | галоўны спецыяліст упраўлення культуры Гродзенскага аблвыканкама; |
| Пятрук А.П. | – | вядучы метадыст ДУК "Гродзенскі абласны метадычны цэнтр народнай творчасці"; |
| Шунейка А.Ф. | – | метадыст выставачнай залы ДУК "Гродзенскі абласны метадычны цэнтр народнай творчасці" |

Дадатак 4
да інструкцыі аб парадку арганізацыі і правядзення рэгіянальнага фестывалю-кірмашу вырабаў рамеснікаў “Гродзенскія традыцыі да свята Вялікадня”

ЗАЦВЯРДЖАЮ
Начальнік аддзела ідэалагічнай работы, культуры і па справах моладзі райвыканкама

Начальнік аддзела культуры гаррайвыканкама

Загадчык сектара культуры райвыканкама
2023 г.

ЗАЯЎКА
на ўдзел у рэгіянальным фестывалі-кірмашы вырабаў рамеснікаў “Гродзенскія традыцыі да свята Вялікадня”

| № п/п | Установа | Прозвішча, імя, імя па бацьку, пасада | Від рамяства | Кантактны тэлефон |
|---|---|---|---|---|
| 1. | | | | |
| 2. | | | | |

Кіраўнік базавай установы ______________
*подпіс*

*Заяўкі дасылаюцца да 20 сакавіка 2023 г. на электронны адрас: (*info@gromc.by*).*
*Тэлефоны для даведак: +375(152)687934, 623792, 623784.*